Мікола Васільевіч Елянеўскі нарадзіўся 5 красавіка 1948 года ў вёсцы Лунін, Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачага . Празаік, член Саюза пісьменнікаў Расіі і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Бацька працаваў бухгалтарам, а маці пасля яго заўчаснай смерці была калгасніцай. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў роднай вёсцы(1966) паступіў у Мінскае паліграфічнае вучылішча. Практыку праходзіў у лунінецкай раеннай газеце " Лунінецкія навіны" і адначасова працаваў у ёй фотакарэспандэнтам.

У 1969-1993гг. служыў ва Узброеных сілах С ССР і Расіі.Падпалкоўнік запаса. У час службы ў войску (1969-1970) пісаў у армейскую газету. Здольнага салдата з Палесся заўважылі ў яе рэдакцыі і прапанавалі паступіць на журналісцкі факультэт Львоўскага вышэйшага вайскова-палітычнага вучылішча, дзе атрымаў журналісцкую адукацыю. Пасля яго заканчэння каля 25 гадоў працаваў у армейскіх газетах у Расіі, Германіі і Ташкенце.

Пасля распаду С ССР Мікола Елянеўскі быў дэмабілізаваны і вярнуўся на радзіму. У расійскім вайсковым гарадку пад Баранавічамі атрымаў кватэру і жыў з сям'ёй. У 1999 годзе пераехаў у Пінск і узначаліў раённую газету " Полесская правда". Друкаваўся ў айчынных часопісах "Неман", " Маладосць", " Беларуская думка", расійскіх часопісах " Наш современник" " Москва", расійскім літаратурным альманаху " Братина", выданнях " Литературная газета", " Литературная Россия", ваенных часопісах " Советский воин", "Крылья Родины". Аўтар кніг аповесцяў і нарысаў" Старший сын", " Небесный штурмовик", " Пушки в небо", раманаў " Мытари и фарисеи"," Время пастыря".

У 2007 годзе за дакументальную аповесць " Хлебный крест " і цыкл нарысаў удастоены звання лаўрэта прэміі Беларускага саюза журналістаў.

Лаўрэат конкурсу 2007 года за лепшы нарыс аб сучасніку, праведзеным Брэсцкім аблвыканкамам сярод журналістаў і СМІ вобласці.

Жывучы ўдалечыні ад радзімы, сувязі з ёю не губляў. Большасць адпачынкаў праводзіў у Луніне ў роднай хаце. Тут ён сябраваў з вядомым на Лунінеччыне кавалём і краязнаўцам Васілем Карпцом. Той зацікавіў вайсковога журналіста былым святаром Лунінскай царквы, аўтарам першай беларускай граматыкі Платонам Ціхановічам. Пачаліся пошукі самой граматыкі, першая частка якой была завершана ў 1875 годзе, а таксама раскрыццё біяграфіі П.М.Ціхановіча. Гэта і складае змест рамана-хронікі " Время пастыря".

Значную частку рамана- хронікі Міколы Елянеўскага складае апісанне пошукаў “ Беларускай Граматыкі” Платона Ціхановіча, хоць на той час яна была ўжо вядомая. Артыкул краязнаўцы пра працу святара з Луніна змешчаны ў яго кнізе “ Адчыніся, таямніца часу…”(1984)

Другую палову кнігі складае апісанне Міколам Елянеўскім звестак з біяграфіі лунінскага святара. У выніку доўгіх пошукаў высветлілася, што Платон Ціхановіч нарадзіўся ў 1838 годзе ў ваколіцах Вылазаў на Піншчыне. Мікола Елянеўскі раскрывае асветную, царкоўна –пастырскую дзейнасць сваайго героя.

Для твора “ Время пастыря” характэрны экскурсы ў даўнюю і пасляваенную гісторыю, ўстаўкі пра выдатных тагачасных святароў, уключэнне ўрыўкаў з царкоўных кніг, са святарскіх артыкулаў,пра ацэнкі твораў Максіма Горкага, паведамленне асобных фактаў сваёй біяграфіі.

У 2008 годзе раман-хроніка “ Время пастыря” прызнаны лепшым творам года на праваслаўную тэматыку. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай царквою узнагароджаны дыпломам першай ступені.

Выразна праяўляецца аўтарская пазіцыя і ў тым,што пісьменнік не абыйшоў увагай такі факт: нашы землякі насуперак патрабаванням уладаў па хрысціянску пахавалі паўстанцаў Кастуся Каліноўскага, якія загінулі ў бітве з расійскімі карнікамі недалёка ад вёскі Хатынічы ў Ганцавічскім раёне.

Мікола Елянеўскі радуецца, што на яго радзіме адноўлены той храм,у якім працаваў Платон Ціхановіч, а вучні Лунінскай школы ў 2006 годзе наладзілі свята ў гонар “170-годдзя чалавека, які адным з першых зрабіў крок да роднай мовы, на гэтай зямлі і ў гэтым храме”, да юбілею аўтара першай “ Беларускай граматыкі”.

Ён вельмі любіў сваю малую радзіму. Часта прыязджаў сюды і заўседы быў жаданым госцем у роднай школе, дзе менавіта па яго ініцыятыве пачалі ладзіць паэтычнае свята “ Лунінская восень”, якое набыло статус абласнога фестывалю творцаў. З’яўляецца лаўрэатам літаратурнай прэміі ім. У.Калесніка за 2011 год.

15 студзеня 2013 года пасля цяжкай хваробы перастала біцца сэрца творчай асобы, дасведчанага краязнаўцы.

**Елянеўскі Мікалай Васільевіч** лаўрэат прэміі Беларускага Саюза журналістаў ”За дакументальную аповесць “ Хлебный крест” і цыкл нарысаў (2007), лаўрэат конкурсу Брэсцкага аблвыканкама “ за лепшы нарыс аб сучасніку” (2007) сярод журналістаў і СМІ вобласці і лаўрэат прэміі ім. У.Калесніка (2011). Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь І Беларускай праваслаўнай царквою ” раман-хроніка “ Время пастыря”(2008)

прызнаны лепшым творам года на праваслаўную тэматыку, і узнагароджаны дыпломам першай ступені.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2013 г. Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Бабута Алена Уладзіміраўна, гал. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі.


1. **Еленевский, Н.** Небесный штурмовик: очерки, документальные повести Николай Еленевский.- Пинск: Пинская региональная типография,2004.- 146с.

**2. Еленевский,Н.** Время пастыря:роман- хроника / Николай Еленевский //Неман.- 2007. - №4

**3.Ткачёв, В.** Возвращение: вступительная статья / Василь Ткачёв //Еленевский, В. Время пастыря.- 2011.- Минск: Издательство "Четыре четверти", - 2011.- С.3-8.

5. **Еляneўскі, М.** Манастыр / Мікола Еляneўскі // Лунінецкія навіны.-2012.- 27ліп. (№55).- С4.

**6. Мікола Еляneўскі** //Літаратурная карта Берасцейшчыны / укл.А.Крэйдзіч.-Брэст: ААТ" Брэсцкая друкарня", 2008.- С.339-341.

7. **Творчыя сустрэчы:** пісьменнікі ў Лунінецкай ЦРБ/Ліля Плаўсюк //Бібліятэка прапануе.- 2012. - №9.- С.35-36

**8. Ткачёв, В. Возвращение** /Василь Ткачёв //Нёман.- 2011.- №11.- С.212-215.- Рецензия на книгу: Время пастыря: роман-хроника / Николай Еленевский. Минск:Четыре четверти, 2011. 213,[2]с

**9. Еляneўскі,М.** Кротаўская трагедыя: дакументальны нарыс: [з гісторыі вёскі Кротава Іванаўскага раёна ] / Мікалай Еляneўскі // Маладосць.- 2010.- №11.- С.114-123.

**10. Еленевский,Н.** Чужие горы: повесть / Николай Еленевский // Армия и культура.- 2009.- №1.- С.- 17-36.

**11. Еленевский,Н.** Прикрывать до конца! : рассказ / Николай Еленевский //Наш современник.- 2006.- №12.- С.69-72.

**12. Еленевский, Н**. Мытари и фарисеи: роман /Николай Еленевский //Неман - 2012.- №7.-С.-3-45.( продолжение в № 8)

**12**. Памяці калегі // Заря.- 2013.- 17 студз.(№5).-С.22.